3. *Пустовіт, Г. П.* Теоретико-методичні основи екологічної освіти і виховання учнів 1-9 класів у позашкільних навчальних закладах : монографія / Г. П. Пустовіт. — Київ ; Луганськ : Альма-матер, 2004. — 540 с.
4. *Кудіна, В.* Освіта для сталого розвитку у роботі педагогічного працівника сучасного навчального закладу освіти / В. Кудіна // Освіт. комент. — 2011. — № 7/9. — С. 36—37.
5. *Гавриш, Н.* Перші кроки впровадження у дошкільних закладах України освіти для сталого розвитку / Н. Гавриш, О. Саприкіна // Початк. шк. — 2014. — № 10. — С. 55—58.
6. *Присяжнюк, Л.* Збережемо планету для майбутніх поколінь: формування в дошкільників основ екологічної свідомості в контексті стратегії сталого розвитку / Л. Присяжнюк // Дошк. виховання. — 2020. — № 2. — С. 3—6.

УДК 378

**Сватко Дзіяна Рыгораўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Жамчужненскі яслі-сад”, аг. Жамчужны, Рэспубліка Беларусь, zhemch-sad@Baranavichy.edu.by*

# АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ З ДЗЕЦЬМІ З ДЗІЦЯЧЫМ ЦЭРЭБРАЛЬНЫМ ПАРАЛІЧОМ ВА ЎСТАНОВЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

У артыкуле раскрываюцца асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу з дзецьмі з дзіцячым цэрэбральным паралічом у дзіцячым садзе, эфектыўныя прыёмы карэкцыйнага ўздзеяння на эмацыянальную і пазнавальную сферу дзяцей з дзіцячым цэрэбральным паралічом, правіла для паспяховай арганізацыі адукацыйнага працэсу, практыкаванні, якія можна ўключаць на занятках.
**Ключавыя словы:** дзіцячы цэрэбральны параліч; рухальны навык; адукацыйны працэс.

**Svatko Diana Grigorievna**
*Zhemchuzhny Nursery-kindergarten, ag. Zhemchuzhny, Belarus, zhemch-sad@Baranavichy.edu.by*

# THE FEATURES OF THE DUCATIONAL PROCESS WITH CHILDREN WITH INFANTILE CEREBRAL PALSY IN PRESCHOOL INSTITUTION

The article reveals the features of the organization of the educational process with children with infantile cerebral palsy in kindergarten, effective methods of corrective action on the emotional and cognitive sphere of children with cerebral palsy, the rule for successful organization of the educational process, exercises that can be included in classes.
**Key words:** infantile cerebral palsy; moving skill; educational process.

**Уводзіны.** Дзіцячы цэрэбральны параліч (далей — ДЦП) — гэта комплекс парушэнняў, якія ўплываюць на здольнасць чалавека рухацца, падтрымліваць раўнавагу і выправу. Слова «цэрэбральны» паказвае на стан, які датычыцца галаўнога мозгу, а «параліч» азначае «слабасць», цяжкасці з кантролем мышцаў. Цэрэбральны параліч развіваецца з прычыны парушэння нармальнага развіцця цэнтральнай нервовай сістэмы або пашкоджанні галаўнога мозгу, што ўплывае на здольнасць кантраляваць свае мышцы. Праявы захворвання разнастайныя і адпавядаюць цяжкасці стану дзіцяці з ДЦП: ад патрэбы ў староннняй дапамозе на працягу ўсяго жыцця да здольнасці хадзіць, выкарыстоўваючы спецыяльныя сродкі, ці нават цалкам самастойна. Дзеці з парушэннямі апорна-рухальнага апарата цяжка адаптуюцца ў дзіцячым садзе. Каб пазбегнуць стрэсавых сітуацый, неабходна правільна падысці да праблемы адаптацыі дзяцей. Патрэбна цесная арганізаваная ўзаемасувязь бацькоў і педагогаў. Выпрацоўка адзіных патрабаванняў педагогаў і бацькоў да паводзін дзіцяці — важная ўмова, якая палягчае яго адаптацыю ў дзіцячым калектыве. Пры гэтым неабходна ўлічваць асаблівасці ўзросту, псіхафізічныя магчымасці дзяцей, а таксама індывідуальныя асаблівасці дзіцяці [1, с. 5].

Мэта: раскрыць асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу з дзецьмі з ДЦП у дзіцячым садзе. Задачы: раскрыць паняцце «дзіцячы цэрэбральны параліч»; фарміраваць уяўленні аб асаблівасцях адаптацыі дзяцей з ДЦП у дзіцячым калектыве; паведаміць аб асаблівасцях арганізацыі адукацыйнага працэсу з дзецьмі з ДЦП.

**Асноўная частка.** Нягледзячы на вывучанасць праблемы ДЦП з клінічнага і псіхолагапедагагічнага пункту гледжання, вопыт карэкцыйна-развіваючага навучання гэтых дзяцей ва ўмовах установы адукацыі невялікі. Але ранняе ўвядзенне дзяцей з ДЦП у адукацыйны працэс дазваляе дасягнуць больш значных станоўчых вынікаў у сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі.

Л. С. Выгоцкі ўказваў на неабходнасць стварэння такой сістэмы адукацыі і выхавання, у якой дзіця з абмежаванымі магчымасцямі не будзе выключана з соцыўма дзяцей з нармальным развіццём. Ён лічыў, што спецыяльная школа вядзе да яшчэ большай ізаляцыі дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі ад

© Сватко Д. Р., 2021



Рэпозиторий БарГУ

нармальнага грамадства. Вузкі круг зносін, абмежаваны свет, прыстасаваны да дэфекту дзіцяці, перашкаджае яго сацыяльнай адаптацыі [2, с. 356].

Выхавальніку важна ўстанавіць узаемадзеянне з дзіцём, як толькі ён паступіў у дзіцячы сад. Калі ў яго няма навыку зносін са староннімі людзьмі, то дзіця можа праяўляць залішнюю нервовасць, плакаць, вырывацца з рук. У гэтым выпадку можна дазволіць маме знаходзіцца са сваім дзіцём у групе. Тады дзіця супакоіцца, у яго знікне страх перад новым становішчам, яно пачне праяўляць зацікаўленасць у цацках. У гэты ж час мама матывуе дзіця звяртацца да выхавальніка з рознымі просьбамі. А выхавальнік садзейнічае адаптацыі дзіцяці добрымі словамі, паказвае што-небудзь цікавае, дае ў рукі цацку, усталёўвае давяральныя адносіны.

У працэсе арганізацыі адукацыйнай дзейнасці з дзіцём з ДЦП неабходна памятаць, што засваенне вучэбнага матэрыялу павінна паралельна фарміраваць камунікатыўныя ўменні, узбагачаць эмацыянальны вопыт, актывізаваць мысленне, праектаваць грамадскія ўзаемадзеянні і рухальныя акты. Псіхалагічны стан дзіцяці ў пэўны момант можа стаць прычынай змены метадаў, прыёмаў і структуры заняткаў [2, с. 56].

Эфектыўнымі прыёмамі карэкцыйнага ўздзеяння на эмацыянальную і пазнавальную сферы дзяцей з ДЦП з'яўляюцца: гульнявыя сітуацыі; дыдактычныя гульні; гульнявыя трэнінгі, якія спрыяюць развіццю зносін з іншымі дзецьмі; псіхагімнастыка і рэлаксацыя, якія дазваляюць зняць спазмы і заціскі, асабліва ў вобласці твару і рук; масаж і самамасаж.

Пры вызначэнні сістэмы работы па карэкцыі парушэнняў рухаў патрэбна ўлічваць, што асабістая нязрэласць дзіцяці, якое страдае цэрэбральным паралічом, праяўляецца ў слабасці волевых установак, эмацыянальнай лабільнасці. Устойлівыя няўдачы пры спробах прайграць патрэбны рух ці дзеянне можа прывесці да адказу ад заняткаў, таму патрэбна прытрымлівацца наступных правілаў для паспяховай арганізацыі адукацыйнага працэсу:

– быць цярплівым і назіральным. Дзеці маюць патрэбу ў адпачынку, неабходна ўмець арганізоўваць гэты адпачынак своечасова;
– размаўляючы з дзіцём, патрэбна даваць яму час, каб адказаць на пытанні, гаворыць па чарзе, памятаць пра важнасць паўтарэння;
– захоўваць паслядоўнасць, рухацца ад простага да складанага;
– уносіць новыя элементы на кожным занятку, заахвочваць дзіця;
– быць выразным, эмацыянальным, змяняць інтанацыі голасу;
– выкарыстоўваць пахвалы;
– даваць дзецям больш самастойнасці ў выбары рашэнняў і адказаў — гэта спрыяе развіццю самастойнасці.

На занятках можна ўключаць наступныя практыкаванні: разгладзіць ліст паперы далонню правай рукі, прытрымліваць яго левай рукой і наадварот; пастукаць па стале паслабленай правай (левай) рукой; павярнуць правую руку на рабро, сагнуць пальцы ў кулак, выпраміць, палажыць руку на далонь; зрабіць тое ж самае з левай рукой; рукі напаўсагнутых, апора на локці — устрэсванне па чарзе далонямі; рукі перад сабой, апора на перадплечча, па чарзе змена становішча далоняў: сагнуць—разагнуць; павярнуць далонь да твару, да стала і г. д.); фіксаваць левай рукой правае запясце — пагладжваць далонню правай рукі, пастукаць далонню па стале і г. д.

Адначасова неабходна праводзіць работу і па развіцці рухаў пальцаў рук, асабліва правай: злучыць канцавыя фалангі выпрамленых пальцаў рук («домік»); злучыць запясныя суставы, далоні разамкнуць, пальцы адвесці («кошык»).

Неабходна ўдзяляць увагу фарміраванню проціпастаўлення першага пальца ўсім астатнім; на легкае згінанне і разгінанне пальцаў рук без рухаў далоні і перадплечча, якімі яны часта замяшчаюцца. Для гэтага неабходна выкарыстоўваць наступныя практыкаванні: сціснуць пальцы правай рукі ў кулак — выпраміць; сагнуць пальцы адначасова і па чарзе; проціпастаўляць першаму пальцу ўсе астатнія па чарзе; шматразова згінаць і разгінаць пальцы [3].

**Заключэнне.** У жыцці любога дзіцяці аднойчы надыходзіць такі этап, калі яму становіцца мала зносін толькі са сваёй сям'ёй (з бацькамі, бабуляй ці няняй) і яму неабходныя кантакты ў дзіцячым калектыве. Гэта значыць, пара адпраўляцца ў дзіцячы сад. Гэты момант немалаважны і для здаровых дзяцей, мае асаблівае значэнне для дзяцей з ДЦП, таму што ўзаемаадносіны з аднагодкамі ў дашкольным узросце, як правіла, становяцца асновай для фарміравання далейшых навыкаў зносін і сацыялізацыі ў грамадстве. Выхавальніку важна памятаць, што ў дзяцей з ДЦП не толькі не сфармаваны рухальныя навыкі з-за захворвання, але і адсутнічаюць правільныя ўяўленні аб руху.

Такім чынам, пры развіцці рухальных навыкаў і ўменняў у дзяцей з ДЦП важна не толькі развіваць той ці іншы рухальны навык, але і выхоўваць правільнае ўяўленне пра яго праз адчуванне рухаў: фарміраванне навыку самаабслугоўвання; развіццё практычнай дзейнасці і падрыхтоўку рукі да пісьма. Важна памятаць, што авалоданне рухальнымі навыкамі адбываецца паэтапна і патрабуе шмат часу і вялікага цярпення з боку дарослага. Развіццё рухальных навыкаў мэтазгодна выкарыстоўваць у выглядзе цікавых і зразумелых для дзяцей гульняў, якія адпавядаюць яго рухальным магчымасцям. Неабходна ўдзяляць асаблівую ўвагу развіццю сэнсарных эталонаў. Ручныя навыкі неабходна развіваць паэтапна: навучыць адвольна браць, апускаць прадметы, перакладаць іх з рукі ў руку, перамяшчаць у пэўнае месца,

Рэпазіторый БарДУ

выбіраць прадметы. Развіваць канструктыўныя здольнасці ў розных відах прадуктыўнай творчай дзейнасці, пры гэтым педагог працуе з дзецьмі «рука у руцэ», паступова прывучаць іх да самастойнага выканання. Перад тым, як перайсці да працэсу навучання грамаце і пісьму, важна навучыць дзіця канструяваць асіметрычныя літары з палачак і абводзіць літары з дапамогай алоўка. Таксама неабходна ўключаць у заняткі практыкаванні з апорай на зрокавы або зрокава-тактыльны аналізатар. Напрыклад, пры засваенні матэматычных дзеянняў, якія патрабуюць ад дзіцяці пераліку, выкарыстоўваць наглядныя прадметы і маніпуляцыі з імі, неабходна стымуляваць маўленчую актыўнасць з дапамогай апісання прадметаў, дзеянняў, загадвання і адгадвання загадак. Выкарыстоўваць гульні і практыкаванні на фарміраванне правільнага маўленчага дыхання, моцнай паветранай бруі. Неабходна выхоўваць дзяцей з дзіцячым ДЦП паўнавартаснымі членамі грамадства і ставіцца да іх адпаведна.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Архипова, Е. Ф.* Коррекционная работа с детьми с церебральным параличом / Е. Ф. Архипова. — М. : Просвещение, 1989. — 79 с.

2. *Выготский, Л. С.* Педагогическая психология / Л. С. Выготский. — М., 1999. — 536 с.

3. *Гудкова, Т. В.* Особенности организации в проведении коррекционных занятий с детьми с ДЦП [Электронный ресурс] / Т. В. Гудкова // Проблемы и перспективы развития образования : материалы III Междунар. науч. конф., г. Пермь, янв. 2013 г. — Пермь : Меркурий, 2013. — С. 97—99.. — Режим доступа: https://moluch.ru/conf/ped/archive/66/3332/ . — Дата доступа: 15.12.2020.

УДК 373.2

**Титовец Татьяна Евгеньевна[1],** кандидат педагогических наук, доцент,
**Гун Лихуа[2]**
*Учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка», Минск, Республика Беларусь, [1]t_titovets@mail.ru , [2]gonglihua@mail.ru*

# КОМПАРАТИВНЫЙ АНАЛИЗ ТРАДИЦИЙ КОНСТРУИРОВАНИЯ ПРЕДМЕТНО-ПРОСТРАНСТВЕННОЙ СРЕДЫ УЧРЕЖДЕНИЙ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ И КИТАЕ

В статье раскрываются схожие для Беларуси и Китая требования к качеству предметно-пространственной среды учреждений дошкольного образования, которые проявляются в принципах разнообразия и всесторонности, народности, трансформируемости. Описываются отличительные признаки предметно-пространственной среды учреждений дошкольного образования обеих стран, которые заключаются в приоритетности идей психологического комфорта и стимулирования эвристической деятельности детей для Беларуси и направленности среды на развитие самостоятельности ребёнка и его эстетического вкуса в Китае.

**Ключевые слова:** предметно-пространственная среда; дошкольное образование; компаративный анализ.

**Tsitavets Tatsiana Evgenievna[1]**, PhD in Education, Associate Professor,
**Gong Lihua[2]**
*Belarusian State Pedagogical university named after Maxim Tank, Minsk, Republic of Belarus, [1]t_titovets@mail.ru , [2]gonglihua@mail.ru*

# COMPARATIVE ANALYSIS OF TRADITIONS OF DESIGNING EDUCATIONAL ENVIRONMENT FOR PRESCHOOL EDUCATION INSTITUTIONS IN BELARUS AND CHINA

The article reveals similar requirements for the quality of the educational environment of preschool education institutions for Belarus and China, which are manifested in the principles of diversity and comprehensiveness, nationality, transformability. The article describes the distinctive features of the educational environment of preschool education institutions in both countries, which consist in the priority of the ideas of psychological comfort and stimulation of heuristic activity of children in Belarus and the orientation of the environment to the development of the child's independence and aesthetic taste in China.

**Key words:** education environment; preschool education; comparative analysis.

**Введение.** Одной из важных задач развития системы дошкольного образования в Республике Беларусь является дальнейшая индивидуализация и дифференциация образовательных услуг для детей дошкольного возраста в целях удовлетворения запросов населения. Решение данной задачи требует пересмотра требований к конструированию предметно-пространственной среды учреждений дошкольного образования, в которой будет реализовываться образовательный процесс. Ключевым механизмом совершенствования любой национальной системы обучения и воспитания является её анализ с позиции межкультурного контекста, выявление культурологических парадигм, в рамках которых данная система

© Титовец Т. Е., Гун Л., 2021

Репозиторий БарГУ